Таким образом, можно сделать вывод, что информация Лаоника Халкокондила представляет значительный интерес как для исследователей средневековой Восточной Европы в целом, так и для специалистов, занимающихся изучением Великого княжества Литовского. В настоящее время нами ведется работа по переводу «Скифского фрагмента» и подготовке его к печати.

1. Веселаго, Е.Б. Еще раз о Лаонике Халкокондиле и его историческом труде / Е.Б. Веселаго // Византийский временник. – 1958. – Т. XIV. – С. 190–199.
2. Диттен, Г. Известия Лаоника Халкокондила о России / Г. Диттен // Византийский временник. – 1962. – Т. XXI. – С. 51–94.
3. Мартынюк, А.В. Пять текстов, о которых следует напомнить исследователям восточноевропейского Средневековья / А.В. Мартынюк // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы. – 2010. – Вып. 3. – С. 9–16.
4. Europa im XV. Jahrhundert von Byzantinern gesehen / Hrsg. von E. v. Ivánka. – Graz, 1965.
5. Laonici Chalcocandylae historiarum demonstrations / Ed. E. Darko. – Budapestini. – 1922. – T. I.

**Шэлегава К.Дз.**

## НАТАТКІ «ПРА ЛІТВУ» ЭНЭЯ СІЛЬВІЯ ПІКАЛАМІНІ ЯК КРЫНІЦА ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ ПАГАНСКІХ КУЛЬТАЎ БАЛЦКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ВКЛ XV ст.

Шэраг іншаземцаў пакінулі творы, у якіх змяшчаецца каштоўная інфармацыя па гісторыі, звесткі па матэрыяльнай і духоўнай культуры ВКЛ. Адным з такіх аўтараў з'яўляецца Энэй Сільвій Пікаламіні, які пакінуў нататкі «Пра Літву». Энэй Сільвій паходзіў з старажытнага сіенскага роду Пікаламіні, атрымаў адукацыю ў Сіенскім універсітэце, быў вядомым пісьменнікам-гуманістам Кватрачэнта. У перыяд з 1430–1446 гг. Пікаламіні быў на службе ў трох біскупаў і кардыналаў, а таксама ў германскага імператара Фрыдрыха III, выконваючы функцыі пасла, наведаў шмат краін Еўропы, пра якія пакінуў гісторыка-геаграфічныя працы. Ва ўзросце пяцідзесяці трох гадоў стаў папай Рымскім, прыняўшы імя Пій II. Напрыканцы жыцця напісаў першую аўтабіяграфію папы Рымскага, вядомую як «Каментарыі», дзе апісаў свае падарожжы [1, с. 233-235, 250]. На жаль, на сённяшні дзень з дазволу царквы былі пераведзеныя з сярэднявечнай латыні і надрукаваныя толькі кароткія вытрымкі з 12-томнай біяграфіі Пія II. Але асобныя нататкі былі змешчаны ў кнізе «Aeneae Sylvii historia de Europa c XXVI», якая была надрукавана ў 1551 г. у Базэлі. На працу Пікаламіні, як на каштоўную крыніцу, ссылаўся В.М.Тацішчаў у сваёй «Истории Российской». Як крыніцу па гісторыі Прусіі яе выкарыстоўвалі нямецкія гісторыкі Т. Хірш, М. Цёпен, Э. Штрэльке ў сваёй акадэмічнай працы «Scriptores rerum Prussicarum», выдадзенай у Лейпцыгу ў 1870 г. [3, с. 290-292]. З беларускіх гісторыкаў нататкі выкарыстоўваў у сваіх даследваннях П.Урбан.

У сваіх запісах Энэй Сільвій дае кароткі гісторыка-геаграфічны агляд ВКЛ пач. XV ст., а менавіта звесткі пра геаграфічнае становішча Літвы, пра ўрады Ягайлы, Вітаўта, Жыгімонта Кейстутавіча, Свідрыгайлы, а таксама змяшчае інфармацыю пра матэрыяльную і духоўную культуры жыхароў Літвы. Найбольш змястоўнымі і цікавымі атрымаліся апісанні язычніцкіх культаў і звязаных з імі абрадаў, і іх выкараненне хрысціянскімі місіянерамі. Таму мэта дадзенай працы: вызначыць каштоўнасць нататкаў «Пра Літву» Энэя Сільвія Пікаламіні для даследавання паганскіх культаў ў ВКЛ падчас прыняцця хрысціянства каталіцкага абраду пасля падпісання Крэўскай уніі.

Трэба зазначыць, што нататкі «Пра Літву» былі напісаныя Пікаламіні са слоў ліцвінаў, з якімі ён сустрэўся падчас працы Базэльскага Сабора «ў царкве на тым баку Рэйна, ля Картуса» [2]. Пікаламіні ў сваіх запісах падзяляе ўсіх ліцвінаў на некалькі груп у залежнасці ад веры, якую яны вызнавалі: першая – хто «прытрымліваюцца памылак грэкаў», другая – паганцы, што «блукаюць у цемры, укленчваючы перад ідаламі», трэцяя – хто «прыведзен да Хрыста» [2]. Для аўтара найбольш цікавай

Репозиторий ВГУ

з’яўляецца другая група ліцвінаў, якія па-ранейшаму застаюцца паганцамі (гаворка ідзе, відавочна, пра насельніцтва паўночна-заходняй часткі ВКЛ). Іх хрышчэнне пачынаецца «пасьля таго як Уладыслаў…прыняў польскае каралеўства» і выказаў «становчыя словы, што евангельле Хрыста прыйдзе і да князя Вітаўта, у Літву» [2].

Аўтар яскрава апісвае існуючыя на той час паганскія культы і абрады, якія можна класіфікаваць наступным чынам: пакланенне вужакам; агню; сонцу і ўшанаванне «зялезнага молата»; ушанаванне святарных лясоў, «прысвечаных дэманам», а таксама маленькіх святарных гаёў, дзе пакланяліся багам. Пакланенне вужакам праяўлялася ў тым, што кожная сям’я трымала гэтых істотаў у хаце, клапацілася пра іх і ўшаноўвала, «кідаючы ахвяраў ў сена» [2]. Абрад пакланення агню праходзіў у святарным месцы ўначы, «каб пабачыцца з ценямі памерлых, каб запытацца ў іх ля агню і палучыць адказы» [2]. Адказ тлумачыўся характарам хвалявання агню і ў залежнасці ад гэтага паганцы «вызначаліся са сваімі справамі» [2]. Культ пакланення сонцу і ўшанаванне «зялезнага молата» тлумачылі законы светабудовы. У святарных лясах і маленькіх святарных гаях знаходзіліся старыя дрэвы, дзе «жывуць магутныя богі», якія і былі галоўным аб’ектам ушанавання, менавіта сюды паганцы прыходзілі «звяртацца да моцы боскай, каб атрымаць і дождж, і сонейка» [2]. Пікаламіні прыводзіць атрыманыя ад сваіх суразмоўцаў звесткі пра спраўленне абрадаў. Яго асабліва ўразіў культ пакланення сонцу, якім ён з запалам першаадкрывальніка і гуманіста шчыра захапляўся: «гэта выключны і рэдкі культ па сваёй велічы» [2].

Таксама аўтар паведамляе і пра хрысціянізацыю паганцаў, у якой значную ролю адыграў чэшскі тэолаг, асабісты святар Ягайлы Геранім Пражскі, адзін з тых, з кім вёў сваю гаворку Пікаламіні. Геранім распавёў пра канкрэтныя дзеянні свае і іншых місіянераў па распаўсюджванню хрысціянства, якія ў асноўным звадзілася да знішчэння паганскіх артэфактаў (місіянеры спачатку падманам вызнавалі аб месцы знаходжання паганскіх капішчаў і месцаў пакланення духам і багам, а пасля бязлітасна іх спальвалі і знішчалі), а пасля ўжо прапаведніцтва. Гэта тлумачылася простай логікай – «святары ня служаць боствам, бо знік аб’ект для ўшанавання». Геранім Пражскі быў непасрэдным ўдзельнікам падзей, што надае яшчэ большую каштоўнасць атрыманай інфармацыі, да таго ж яе дакладнасць у агульных рысах пацвержана ў іншых гістарычных крыніцах. Акрамя Гераніма было шмат іншых місіянераў, іх актыўная дзейнасць параўноваецца аўтарам с «хвалюючым шматлюдным спаборніцтвам» [2]. Але, не гледзячы на гэта, хрысціянізацыя праходзіла марудна з-за моцнага супраціву паганцаў, які быў выкліканы некалькімі прычынамі: на думку аўтара гэта страх людзей здрадзіць сваёй веры – «яны лепш пакідалі б свае хаціны і зямлю, але не перанятую і наказаную дзядамі веру» [2]; а таксама гвалтоўныя метады місіянераў. З мэтай заспакаення народа вялікі князь Вітаўт скасаваў загад намеснікам ваяводстваў дапамагаць місіянерам і выслаў іх за межы княства. Але працэс хрысціянізацыі быў распачаты і, як паведамляе Пікаламіні, на час напісання ім нататак (прыкладна 1430-1440-я гг.) ужо большая частка літоўскіх паганцаў была каталікамі.

Такім чынам, звесткі аб паганскіх культах і ходзе хрысціянізацыі Літвы пададзены, у першую чаргу, з пазіцыі рэнесанснага даследчыка-гуманіста, а не прадстаўніка каталіцкай царквы, якім у той час з’яўляўся Пікаламіні, і таму даволі аб’ектыўныя і дакладныя, наколькі гэта магчыма, улічваючы што аўтар не з’яўляўся непасрэдным сведкам падзей.

1. Записки о достопамятных деяниях Пия II // Средние века. – М., 1997. – № 9. – С.233-253
2. Энэй Сільвій Пікаламіні. Пра Літву [Сецеўны рэсурс] / Рэжым доступу: http://library.by/portalus/modules/belarus/readme.php?subaction=showfull&id=1142360294&archive=&start_from=&ucat=8&
3. Schaff, Ph. History of the Christian Church, vol. VI: The Middle Ages. A.D. 1294-1517 / Philip Schaff. – Dallas: Church Classics Library, 1882. – P. 542

Рэпазіторый ВДУ